Спецыяльны выпуск, прысвечаны 60-годдзю
філалагічнага факультэта
Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна

# Берасцейскі універсітэт

ГАЗЕТА БРЭСЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ А.С. ПУШКІНА № 16 (71) 1 снежня 2005 г.

### НАСТАЎНІКУ

*Ул.А. Калесніку*

*З надзеяй, любоўю і вераю,*
*былінка ў сусвеце людзей,*
*спакон і заўсёды верую:*
*ёсць ранак, то будзе і дзень.*

*Не кожны трымаецца вернасці –*
*прадажны, няверны час!*
*Ні веры, ні страху, што вернуцца*
*любоў і надзея да нас.*

*Спыніцца б – часу не дадзена.*
*Няверʼе – хоць гвалт крычы!*
*Жыццёвае веры прадзіва*
*замацаваць бы...Чым?!*

*Надзея на кон пастаўлена...*
*Хто да чаго дабяжыць...*
*Ты не дазволь, Настаўнік, нам*
*без веры святое жыць!*

**Мікола Аляхновіч**

## Да 60-годдзя філалагічнага факультэта

### 1 снежня

Рэгіянальная канферэнцыя “***Навукова-педагагічныя і духоўна-культурныя набыткі філалагічнага факультэта***”

**10:00–12:00**

Пленарнае пасяджэнне
(*вучэбны корпус № 2, актавая зала, 2-і паверх*)

**13:00–16:00**

Праца секцый
(*вучэбны корпус № 2, 3-і паверх*)

**17:00**

Выступленне народнага ансамбля “Лявоны”
(*вучэбны корпус № 2, актавая зала, 2 паверх*)

### 2 снежня

**11:00**

Урачыстае адкрыццё чытальнай залы
(*вучэбны корпус № 2, аўд. 324*)

**11:30**

Падвядзенне вынікаў конкурсу творчых прац студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, прысвечанага 60-годдзю Вялікай Перамогі, юбілею універсітэта і факультэта
(*вучэбны корпус № 2, аўд. 324*)

**12:00**

Сустрэчы ветэранаў факультэта, выпускнікоў розных пакаленняў са студэнтамі
(*вучэбны корпус № 2, 3-і паверх*)

**14:00**

Мастацкая праграма “***Філфак – і маладосць, і лёс***”
(*Тэатр драмы і музыкі*)

**17:00**

Святочная вячэра

**19:00**

Танцавальна-забаўляльная праграма для студэнтаў
(*галоўны вучэбны корпус, КДЦ “Діксі”*)

*Аргкамітэт*

## ФІЛФАК – НАШ ЛЁС



*Зоя Пятроўна Мельнікава, дэкан факультэта, доктар філалагічных навук, прафесар*

Філалагічная адукацыя ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна з’яўляецца адной з прыярытэтных. На працягу 60 гадоў яе атрымалі тысячы студэнтаў, многія з якіх сталі потым вядомымі ў краіне спецыялістамі: настаўнікамі, пісьменнікамі, выкладчыкамі ВНУ, журналістамі, літаратуразнаўцамі, моваведамі, кіраўнікамі дзяржаўных установ. Факультэт ганарыцца сваімі выпускнікамі: прафесарамі В.Я. Зарэцкай, Г.М. Малажай, А.А. Майсейчыкам, Ст.Р. Рачэўскім, В.І. Сянкевічам; Г.П. Андраюком, рэктарам Брэсцкага дзяржаўнага педінстытута імя А.С. Пушкіна (1970–1989 гг.), Н.І. Кавалец, Героем Сацыялістычнай Працы, Заслужаным настаўнікам БССР, У.В. Гніламёдавым, дырэктарам Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАН Рэспублікі Беларусь, В.І. Іўчанкавым, загадчыкам кафедры БДУ, саветнікам міністра адукацыі па сувязях з СМІ і грамадскасцю, П.А. Міхайлавым, загадчыкам кафедры БГПУ імя М. Танка, У.Л. Філіновічам, загадчыкам аддзела адукацыі Лунінецкага райвыканкама, Я.Г. Жуком, загадчыкам аддзела адукацыі Жабінкаўскага райвыканкама; Л.Д. Дабрадомавай, дырэктарам прадпрыемства “Радыётэлецэнтр. Тэлерадыёкампанія “Брэст”, Р.Р. Бысюком, начальнікам упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама, пісьменнікамі і паэтамі А.Разанавым, В.Жуковічам, М.Пракаповічам, А.Каско і многімі інш.

У далёкім 1945 годзе на гісторыка-філалагічнае аддзяленне настаўніцкага інстытута прыйшло 27 студэнтаў, якія за два гады навучання атрымалі прафесію настаўніка беларускай і рускай мовы і літаратуры, а таксама гісторыі. У 40-я гады аддзяленнем кіраваў М.Ю.Дуброўскі – выкладчык беларускай літаратуры, член Саюза пісьменнікаў. Пазней дэканамі факультэта былі М.М. Моладаў, П.Ф. Шляхтуноў, Р.Л. Кароткі, Л.П. Смальянава, А.А. Майсейчык, В.Я. Зарэцкая, Ю.В. Паталкоў, М.М. Аляхновіч, У.А. Сенькавец.

Восенню 1950 года быў створаны філалагічны факультэт, на які паступілі 50 студэнтаў. З часам на факультэце ўтварыліся кафедры беларускай літаратуры, беларускай і рускай моў, рускай і замежнай літаратур.

Сёння на факультэце сем кафедраў, на якіх рыхтуюць філолагаў па наступных спецыяльнасцях: “Беларуская мова і літаратура” са спецыялізацыямі і дадатковымі спецыяльнасцямі “Мовазнаўства”, “Літаратуразнаўства”, “Польская мова і літаратура”, “Гісторыя”, “Англійская мова”; “Руская мова і літаратура” са спецыялізацыямі і дадатковымі спецыяльнасцямі “Мовазнаўства”, “Літаратуразнаўства”, “Польская мова і літаратура”, “Украінская мова і літаратура”. Плануецца адкрыццё ў бліжэйшы час спецыяльнасцей “Журналістыка” і “Літаратурная работа”.

На кафедрах факультэта працуе 87 штатных выкладчыкаў. Сярод іх 4 прафесары, 4 дактары навук, 47 кандыдатаў навук, 37 дацэнтаў. На факультэце 9 кабінетаў, дзе студэнты атрымліваюць вучэбную літаратуру па філалагічных дысцыплінах, выконваюць курсавыя і дыпломныя працы. У Навукова-асветным цэнтры імя У. Калесніка працуюць не толькі студэнты, але і аспіранты, выкладчыкі і супрацоўнікі.

За апошнія тры гады кандыдацкія дысертацыі абаранілі 14 чалавек, доктарскія – 2. За гэты ж час выкладчыкамі факультэта было надрукавана больш за 800 навуковых прац, з іх каля 30 манаграфій. Штогод на факультэце праходзяць міжнародныя і рэспубліканскія навуковыя канферэнцыі. Асноўныя накірункі навукова-даследчай дзейнасці выкладчыкаў і студэнтаў звязаны з актуальнымі лінгвістычнымі, літаратуразнаўчымі, краязнаўчымі, адукацыйна-метадычнымі праблемамі сучаснай беларускай навукі. На факультэце склаліся тры філалагічныя школы. Старэйшая – літаратуразнаўчая, заснавальнікам якой быў першы прафесар універсітэта вядомы пісьменнік і вучоны, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі У.А. Калеснік. Яго традыцыі працягваюць малодшыя калегі і вучні, сённяшнія выкладчыкі пад кіраўніцтвам М.І. Мішчанчука, доктара філалагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта БелАА. Навукова-метадычнай школай кіруе прафесар, член-карэспандэнт БелАА В.Я.Зарэцкая (Ляшук). Метадысты і літара-туразнаўцы факультэта распрацоўваюць змест і структуру літаратурнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і канцэптуальныя падыходы да яе рэалізацыі. Імі створаны дзесяткі падручнікаў для школ, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і манаграфій для настаўнікаў па

(Працяг чытайце на 2 стар.)



(Працяг, пачатак – на 1 стар.)

вывучэнні роднай літаратуры. Лінгвістычна-метадычная школа, ля вытокаў якой – прафесар Г.М. Малажай, распрацоўвае лексіка-фразеалагічную сістэму беларускай мовы і лінгвадыдактычныя асновы яе выкладання ў школе і ВНУ. Мовазнаўцы факультэта забяспечваюць школы Беларусі вучэбнымі праграмамі і падручнікамі па беларускай мове, а таксама выдаюць вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў і студэнтаў. У працэсе станаўлення навукова-даследчыя школы навукоўцаў–выпускнікоў факультэта В.І.Сянкевіча,М.М. Аляхновіча, С.А. Каралевіч.

Факультэт мае шырокія міжнародныя навуковыя сувязі: з Акадэміяй Падляскай у Седліцы, Беластоцкім універсітэтам, Люблінскім універсітэтам імя М. Кюры-Складоўскай, Вышэйшай прафесійнай школай у Бялай Падлясцы (Польшча); з Кіеўскім нацыянальным універсітэтам імя Т. Шаўчэнкі, Чарнавіцкім, Валынскім, Адэскім універсітэтамі (Украіна); з кафедрай усходнеславянскай і балтыйскай філалогіі Будапешцкага універсітэта Э. Лоранда (Венгрыя); з Смаленскім, Цвярскім, Казанскім універсітэтамі (Расія). Навукоўцы-выкладчыкі супрацоўнічаюць з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

На факультэце вучацца 1274 студэнты (678 на стацыянары і 596 на АЗН). Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў 97 % студэнтаў займаюцца навуковымі даследаваннямі, выступаюць з дакладамі на канферэнцыях у сваім універсітэце, іншых ВНУ Беларусі, а таксама ў Польшчы, Украіне, Расіі, Літве, Венгрыі. На факультэце працуе 42 навукова-даследчыя групы, у якіх задзейнічаны 311 студэнтаў. За апошнія пяць год 22 навуковыя працы студэнтаў былі адзначаны на рэспубліканскім конкурсе. Штогод выходзіць зборнік навуковых прац студэнтаў "Станаўленне".

Праводзіцца вялікая праца са студэнцкай моладдзю. На факультэце фарміруецца агульная і прафесійная культура студэнтаў, яны далучаюцца да каштоўнасцяў нацыянальнага і агульначалавечага мастацтва, развіваюць творчыя здольнасці і эстэтычны густ. Ініцыятыўна дзейнічае студэнцкае самакіраванне, актыўна працуе прафбюро, камітэт БРСМ.

Традыцыйным стала правядзенне фальклорных фестываляў, літаратурных святаў, Дня факультэта, Дзён славянскага пісьменства, розных творчых конкурсаў. Каманда КВЗ філалагічнага факультэта – у ліку лепшых ва універсітэце.

***Дарагія калегі, ветэраны, студэнты, выпускнікі розных пакаленняў філфака! З нашым агульным святам – 60-гадовым юбілеем! Шчасця Вам, поспехаў у нястомнай працы дзеля роднага слова, дзеля філалогіі, дзеля Бацькаўшчыны.***

*Зямля бацькоЎ –*
*Жыцця надзейны грунт.*
*Як цяжка жыць,*
*Калі няма прытулку, калі не чуе*
*Пад нагамі гул*
*Сваёй зямлі:*
*Шукаць дзе паратунку?...*
*Добрыя справы*
*Жывуць разам з намі*
*Як частка нас саміх.*
*Дрэнныя справы*
*Блукаюць, як здані,*
*Вакол нас*
*Ў вяртаюцца зноЎ і зноЎ*
*У нашу свядомасць,*
*Як балючыя згрызоты сумлення.*

***Уладзімір ЛебедзеЎ***

# Няхай жыве і квітнее наш філалагічны факультэт!

**Павіншаваць філалагічны факультэт з юбілеем збяруцца шмат гасцей. А што думаюць аб факультэце «свае», тыя, хто тут працуе ці вучыцца? Якія падзеі з жыцця факультэта застаюцца ў нашай памяці надоўга?**



**Вера Якаўлеўна Зарэцкая, прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі адукацыі Рэспублікі Беларусь:**

" З філалагічным факультэтам у мяне звязана амаль 50 гадоў. І цяжка, амаль немажліва выдзеліць нешта адно, самае яркае. Гэта і студэнцтва – юнацтва, маладосць, захапленне, праца ў гуртках, гэта і праца на кафедры выкладчыкам, загадчыкам кафедры, і 15 гадоў працы дэканам...

Я хачу, каб наш філалагічны факультэт заўсёды вызначаўся высокім навуковым узроўнем, працай людзей, якія ў значнай ступені акрэслілі навуку краіны. Каб набыткі факультэта множыліся. Каб, як і многа гадоў, на факультэце панавала цудоўная атмасфера павагі, спагады, дабрыні, годнасці і інтэлігентнасці. Каб мы высока неслі планку выкладчыка ВНУ... Я жадаю, каб студэнты прыходзілі вучыцца на факультэт не за дыпломам, а за ведамі.

Бясспрэчна, што на факультэце заўсёды вучыліся самыя прыгожыя дзяўчаты. Дай Божа вам усім шчасця ".



**Алена Васільеўна Леванцэвіч, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі:**

"Самая яскравая падзея з апошніх, якая мне вельмі спадабаля і ўразіла, – імпрэза, прысвечаная Дню маці. Прачуліліся да слёз усе, хто там быў. Я нават і не думала, што ў нас такія ўражлівыя выкладчыкі.

Што пажадаць філфаку? Паболей мерапрыемстваў, якія раднілі б нашу філалагічную сям'ю і дапамагалі раскрыцца студэнтам як талентам. Бо вельмі часта творчыя студэнты не зусім раскрываюцца на занятках".



**Елена Лукьянова, 4 курс:**

« Самое яркое впечатление произвёл на меня День факультета. Я думаю, что этот праздник показал: дело, которым занимаются студенты и преподаватели факультета, – важное и нужное.

Я желаю любимому факультету нести в себе дух интеллигентности, о котором нам так много говорили на первом курсе, дарить его окружающим, множить доброе и светлое. Пусть все наши самые авантюрные проекты, самые невероятные и несбыточные мечты осуществляются».



**Анна Мять, 4 курс:**

"Мне нравится здесь учиться: жизнь на факультете интересная и насыщенная. Больше всего запомнился прошлогодний День факультета: работало радио, звучали поздравления, на аукционе можно было «купить» зачёт. Трудно выделить что-то особенное; жизнь на факультете очень разнообразная, часто у нас бывают встречи с писателями и поэтами.

Я желаю факультету процветать и развиваться, пусть из этих стен выходит как можно больше выдающихся личностей".



**Татьяна Александровна Гераськина, доцент кафедры общего и русского языкознания:**

" Самым запоминающимся было время, когда я была куратором одной из групп. Вместе мы организовали агитбригаду и выступали с небольшими концертами в сельских клубах, у пограничников, в школах... Эти поездки нас сплачивали, помогали лучше узнать друг друга.

Я желаю факультету процветания, интересных, ищущих, думающих, независимых студентов, способных пойти на многое ради истины. Студентам желаю интересных, оригинально мыслящих преподавателей, которые будили бы в них интерес к науке и воспитывали благородство".



**Тамара Мікалаеўна Кананенка, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства:**

"Усе падзеі, якія адбываюцца на факультэце, з'яўляюцца цікавымі і яркімі. Выкладчыкі вядуць актыўную навукова-асветніцкую працу, і ў гэтай працы сустрэча са студэнтамі – самая значная падзея.

Я жадаю, каб родны факультэт і надалей шанаваў традыцыі, якія былі закладзены настаўнікамі-пачынальнікамі Г.М. Малажай, В.Я. Зарэцкай, А.А. Майсейчыкам і іншымі. Жадаю творчага жыцця і маладосці".



**Леонид Коробейко, 2 курс:**

« Для меня филфак – это новые знания, знакомство с интересными людьми, участие в играх университетской лиги КВН. Это место, где учатся талантливые и умные люди, которые способны на великие дела.

Я желаю любимому факультету процветания и всего только самого хорошего».



**Кацярына Ішчанка, 2 курс:**

" Адно з самых-самых – фестываль па выніках фальклорнай практыкі. Гэта было цудоўнае выступленне з песнямі, вершамі, у нацыянальных касцюмах – мы паказалі ўсё, на што былі здольныя, усе свае здабыткі падчас фальклорнай практыкі.

Я жадаю роднаму факультэту развіцця: няхай адкрываюцца новыя спецыяльнасці, няхай тут заўсёды будзе добры настрой і спрыяльныя ўмовы для творчасці".



**Вадим Назарук, 1 курс:**

« Самое яркое событие для меня – это, конечно, посвящение в студенты и дискотека в ЦМТ.

Я желаю факультету дальнейшего процветания, чтобы во время вступительной кампании сюда всегда был большой конкурс».



**Уладзімір Ануфрыевіч Лебедзеў, дацэнт кафедры беларускага літаратуразнаўства:**

"Віншую філалагічны факультэт са слаўным юбілеем! Прыемна асазнаваць, што і мне давялося працаваць тут 35 гадоў. Працаваць ва ўніверсітэце і адказна і радасна. Радасна ўваходзіць у студэнцкую аўдыторыю і чытаць лекцыі па гісторыі айчыннай літаратуры, таму што літаратура – гэта жыццё, адлюстраванае ў мастацкіх малюнках і вобразах, гэта ўвасабленне вечнага імкнення чалавецтва да гармоніі. Разам са студэнтамі важна весці дыскусіі па самых актуальных і вечных праблемах жыцця, каб выпрацаваць і акрэсліць грамадскую пазіцыю.

Жадаю філалагічнаму факультэту новых здзяйсненняў, пастаянна ганарыцца сваімі выхаванцамі і выкладчыкамі".



**Лидия Саввична Дорошко, доцент кафедры классической и современной зарубежной филологии, докторант:**

"Одно из самых ярких воспоминаний – это научная конференция, посвящённая 60-летию со дня рождения Н. Матяш. Это было СО-бытие, наполненное высокой интеллектуальной, творческой и личностной энергетикой. Поэт и все присутствовавшие пребывали тогда в силовом поле света.

Желаю факультету процветания, научных дерзаний, постоянных творческих поисков, больше пытливых, целеустремлённых студентов, настоящего союза преподавателей и студентов".



**Ирына Страпко, 5 курс:**

"Самая яркая падзея ў жыцці факультэта – гэта, я думаю, святкаванне яго 57-годдзя. Мы былі яшчэ студэнтамі 3 курса, і цяперашні дэкан Зоя Пятроўна Мельнікава арганізавала для нас сустрэчу з Зінаідай Дудзюк. Усё атрымалася проста здорава: мы чыталі вершы, спявалі частушкі, нават арганізавалі кірмаш.

Я жадаю роднаму факультэту росквіту, разумных студэнтаў, добрых выкладчыкаў. Няхай жыве і квітнее наш філалагічны факультэт".



**Мария Ивановна Шелоник, заместитель декана по воспитательной работе:**

« Факультет – это моя жизнь, это студенты, их проблемы и радости. Мне кажется, если факультет постоянно занимает первые места во многих конкурсах, соревнованиях, значит, он живёт. Самые яркие моменты – когда в наш центр им. В.А. Колесника приходят выдающиеся люди, писатели и просто гости, многие из которых окончили когда-то наш факультет.

Я желаю, чтобы продолжались добрые традиции, заложенные В.А. Колесником, Г.Н. Моложай, В.Я. Зарецкой и многими другими. Чтобы наш факультет, яркий и красивый, был таким всегда».

# Сосуществование славянских языковых стихий

**17–18 ноября 2005 г. на филологическом факультете состоялась II Международная научно-методическая конференция «Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования». Организатором этой конференции, как и предыдущей, прошедшей два года назад, выступила кафедра общего и русского языкознания.**

**Рассказывает её заведующая С.А. Королевич.**

Конференция становится традиционной в силу особой актуальности ее проблематики для нашего региона. Брест расположен на границе славянских земель, и вопросы, вынесенные на обсуждение, интересны и для белорусов, и для поляков, и для украинцев, и для россиян. Наш университет находится в месте сосуществования языковых стихий разных славянских народов, и такое соседство обусловливает наличие в языке региона богатейшего материала для исследований.

Судя по количеству тем докладов, включенных в программу конференции (более 130), её проблематика действительно вызвала большой интерес у наших и зарубежных ученых. Предметом обсуждения здесь стал широкий круг вопросов. В их числе – отражение современных социокультурных процессов в славянских языках; динамика и типология изменений в развитии славянских языков; проблемы взаимодействия кодифицированного литературного языка и нестандартных языковых вариантов; вопросы теории и практики сопоставительного исследования славянских языков и др. Перечисленные проблемы обсуждались на пленарном заседании и на 11 секциях, где прозвучало около 80 докладов, а также были представлены стендовые доклады учёных, которые по разным причинам не смогли принять личное участие в этом научном собрании.

На открытии конференции завкафедрой общего и русского языкознания С.А. Королевич на разных славянских языках приветствовала гостей из Украины, Польши, России. В работе конференции приняли участие ведущие слависты и молодые учёные из ряда вузов нашей страны, из Института языкознания НАН Республики Беларусь.



На открытии конференции с приветственным словом к участникам обратился первый проректор – доктор исторических наук профессор Б.М. Лепешко, который пожелал успехов в творческой научной дискуссии. Декан факультета доктор филологических наук З.П. Мельникова отметила, что столь представительный научный форум, организованный кафедрой, – своеобразный подарок факультету в преддверии его юбилея.

Перед участниками конференции выступили солистка народного камерного хора нашего университета, лауреат многочисленных республиканских и международных конкурсов Л. Лагутенок и детский народный ансамбль «Прибужье» со своей великолепной программой из славянских песен и танцев.

Конференция достигла поставленных задач: оживленные научные дискуссии на заседаниях секций позволили сравнить позиции, сопоставить точки зрения и проверить научные выводы. Выступающие отметили высокий организационный уровень конференции и выразили единодушное пожелание снова встретиться через 2 года на гостеприимной брестской земле.

# Студенческая жизнь на филфаке

## это не только лекции, практические занятия, сессия, практики, научная работа, но и...



*Украинский студенческий экспериментальный театр «Арт-Майдан» основан в 1996 г. Идея его создания принадлежит художественному руководителю, режиссёру и сценаристу Л.С. Дорошко. В репертуаре коллектива – “Усі на ярмарок!”(по мотивам произведений О.Вишни), “Весна говорить про кохання віршами” (по мотивам лирических произведений украинских поэтов), “Одержима” (лирическая драма Л. Украинки) и др.*

*Планируется участие коллектива в Международном фестивале профессинальных и любительских театров в Киеве.*

*И мы играем в КВН! Команда филологического факультета – в лидерах университетской лиги.*





*Поделись душевным теплом и лаской! (Студенты 2 курса в Кобринском детском доме, куда они привезли игрушки, сладости, и желание общаться с малышами).*

*Участники первого тура ежегодного университетского фестиваля «Первокурсник» в 2005 году решили «воскресить» героев романа «Мастер и Маргарита»*





*В поисках фольклора и приключений (студенты 2 курса русско-английского отделения в деревне Орехово Малоритского района)*

*Не кочегары мы, не плотники, а ... активисты БРСМ! Филфаковцы – в составе строительного отряда «5+5».*



*Мастер-класс для молодых талантов от Л. Дранько-Майсюка в научно-просветительском центре имени В.А. Колесника.*





*Для студента важно обладать и верой в себя. Это доказала Татьяна Холодова, став победительницей ежегодного общеуниверситетского конкурса “Поверь в себя! (Студент года – 2003)”.*

# Традыцыі грунтоўнай навуковасці

Кафедра беларускага літаратуразнаўства (да 1992 года – кафедра беларускай літаратуры) заснавана ў 1952 годзе. Спачатку на ёй працавалі два выкладчыкі – Г.А. Крайко і Л.А. Царанкоў. Затым яна папоўнілася яшчэ трыма выкладчыкамі: у ВНУ пачалі працаваць Р.Л. Кароткі, Л.П. Смальянава, У.А. Калеснік. Уладзімір Андрээвіч – былы партызан, пісьменнік, з 1983 года прафесар – узначальваў кафедру ў 1956–1989 гг. Дзякуючы яму былі закладзены традыцыі грунтоўнай навуковасці, творчага падыходу да навучання літаратуразнаўчым дысцыплінам, спалучэння тэорыі з практыкай. Любоў да мастацтва слова выкладчыкі кафедры, а сярод іх прафесары В.Я. Ляшук, А.А. Майсейчык, З.П. Мельнікава, дацэнты У.А. Лебедзеў, Г.М. Праневіч і іншыя, выхоўвалі і на занятках, і падчас сустрэч з пісьменнікамі. У.А. Калеснік са сваімі калегамі і вучнямі зрабіў кафедру асяродкам высокага прафесіяналізму, культуры, дзе выхоўвалася не толькі настаўніцкая, але і літаратурная эліта. Да гэтага часу помняць сваіх настаўнікаў паэты А. Каско, М. Пракаповіч, А. Разанаў, В. Жуковіч і іншыя.

Кафедра беларускага літаратуразнаўства складаецца з 10 чалавек: двух дактароў навук (М.І. Мішчанчук, З.П. Мельнікава), шасці кандыдатаў навук, дацэнтаў і двух старшых выкладчыкаў без ступені. У яе актыве праграмнае забеспячэнне ўсіх вучэбных курсаў (у тым ліку курсаў спецыялізацыі), падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў-філолагаў Да гэтага часу не страцілі сваёй вартасці яскравыя, таленавітыя кнігі У.А. Калесніка пра заходнебеларускую літаратуру, Ул. Жылку, а кніга “Тварэнне легенды” – унікальнае па глыбіні даследаванне літаратуразнаўчых праблем.



На кафедры за апошнія гады абаронены доктарская дысертацыя дэканам факультэта З.П. Мельнікавай і пяць кандыдацкіх дысертацый – К.М. Мароз, А.С. Кавалюк, С.М. Шчэрбай, І.У. Гетманам, Н.М. Борсук.

Свае кнігі выдалі К.М. Мароз, Н.М. Борсук. Дастаткова сказаць, што менавіта новае пакаленне выкладчыкаў выступае з ініцыятывамі правядзення літаратурных сустрэч, вечароў, святкавання юбілеяў, слаўных дат, навуковых канферэнцый. Толькі за апошнія два гады па ініцыятыве кафедры на факультэце адбыліся сустрэчы з Г.Бураўкіным, А.Дударавым, А.Разанавым, рэдкалегіяй часопіса “Дзеяслоў”, была праведзена сустрэча з двойчы Героем Сацыялістычнай Працы У.Бядулем, абмеркавана кніга У.А. Калесніка “Доўг памяці”. Усе добрыя справы цяжка пералічыць.

Кафедра свята шануе традыцыі ВНУ і, па магчымасці, памнажае іх, помніць тых, хто першы пракладаў сцежку на ніве літаратуразнаўчай асветы.

*М.І. Мішчанчук, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт БелАА, загадчык кафедры беларускага літаратуразнаўства*

# Единомышленники

Кафедра общего и русского языкознания – старейшее из структурных подразделений нашего вуза – возникла в 1945 году как кафедра русского и белорусского языков. С 1950 года стала самостоятельной и в течение 42 лет носила название кафедры русского языка (в 1992–1999 гг. именовалась кафедрой славянских языков).

Кафедра имеет богатую историю, которую создавали замечательные люди. У ее истоков стояли бывшие фронтовики – И.И. Зенько, первый заведующий кафедрой, ныне здравствующие ветераны Ю.Н. Лебедева, преподававшая дисциплины историко-лингвистического цикла, И.Г. Молодова, воспитавшая не одно поколение учителей Брестчины. В 50-е годы на кафедре также стали работать М.Н. Молодов, Н.И. Бабушкина, И.К. Германович. В 1954 году на кафедре был оставлен после окончания филологического факультета Г.П. Андреюк (будущий ректор института). Можно сказать, что с этого времени берет начало традиция принимать в коллектив кафедры молодых преподавателей, подготовленных в стенах нашего вуза.

Становление кафедры как научного коллектива неотделимо от имен талантливых педагогов-филологов М.П. Демидовой, В.В. Кузьмина, З.И. Фроловой, Е.В. Шиловой, Л.Ф. Боровковой. Доцент Матильда Прокофьевна Демидова (1929–1990 гг.) была высокопрофессиональным специалистом и талантливым ученым, плодотворно исследующим проблемы стилистики и образности художественной речи. Доцент Вадим Васильевич Кузьмин (1940–1991 гг.) на протяжении 16 лет возглавлял кафедру и запомнился коллегам и студентам как блестящий специалист в теории языкознания.

Именно эти преподаватели помогли определиться в научном поиске тем студентам, которые по-настоящему были увлечены филологией. Сейчас их воспитанники составляют основу кафедры. Это опытные, квалифицированные преподаватели, доценты Т.А. Гераськина, Г.В. Писарук, Е.И. Абрамова, С.А. Королевич, О.Б. Переход, Л.А. Годуйко, А.Ю. Яницкая, ст. преподаватели Т.И. Онищенко и Т.А. Вдовина, ассистенты А.А. Иванюк и Г.А. Веремеюк. Достойное место в коллективе кафедры занимают и представители других научных школ: профессор В.Б. Синюк; выпускники БГУ – доценты Н.М. Гурина, О.А. Фелькина; ст. преподаватель А.А. Посохин, окончивший Российский университет дружбы народов.

С 1991 г. кафедру возглавляет кандидат филологических наук доцент С.А. Королевич. Благодаря ее организаторским усилиям кафедра остается сплоченным коллективом



единомышленников, в котором царит атмосфера взаимопонимания, доверия, уважения. В центре внимания коллектива неизменно находится обеспечение учебного процесса на специальностях филологического факультета.

На кафедре создан ряд учебно-методических пособий, авторами которых являются Г.В. Писарук, В.Б. Синюк, С.А. Королевич, О.А. Фелькина, Е.И. Абрамова и др. Научный потенциал кафедры реализуется в виде многочисленных публикаций, выступлений на научных форумах, в руководстве студенческой научной работой.

В рамках Дней славянской письменностинаши преподаватели и студенты организуют выставки, литературно-музыкальные вечера, творческие конкурсы во славу славянского слова, викторины лингвокультурологического содержания и др.

Из года в год крепнут связи кафедры с учреждениями образования. Наши преподаватели обеспечивают ведение факультативов, курсов-интенсивов, курсов углубленного изучения русского языка в гимназиях, лицеях, средних школах города, выступают на методических объединениях учителей-словесников, ежегодно работают в жюри областных и республиканских олимпиад по русскому языку среди школьников и учащихся профтехучилищ, готовят школьников области к республиканской олимпиаде по русскому языку.

*С.А.Королевич,*
*кандидат филологических наук,*
*доцент,*
*завкафедрой общего и русского языкознания.*

# Служучы роднаму слову

Кафедра беларускага мовазнаўства (раней беларускай мовы) была створана ў 1945 годзе як кафедра беларускай і рускай моў, якой загадваў кандыдат філалагічных навук І.І. Зянько. З 1950 стала самастойнай кафедрай беларускай мовы. Загадчыкамі пасля былі А. С. Барысавец, І.М. Гайдукевіч, Р.Н. Клюсаў, Р.І. Карлаў, М.П. Лукашук. Ад кафедры беларускай мовы пазней ўтварылася кафедра беларускай і рускай моваў з методыкай выкладання, што працуе на псіхолага-педагагічным факультэце. У 1994 годзе ад кафедры беларускай мовы, якую ўзначальвала прафесар Галіна Мікалаеўна Малажай, член-карэспандэнт Акадэміі адукацыі Рэспублікі Беларусь, адгалінавалася кафедра гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі. Узначаліў яе М.М. Аляхновіч, вучань Г.М. Малажай і Ф.М. Янкоўскага. Пераважная большасць абедзвюх кафедраў – выпускнікі філалагічнага факультэта Брэсцкага педінстытута.

Навуковы рост і плён кафедры звязаны найперш з асобаю Г.М. Малажай. Беларуская філалогія стала яе лёсам, яе радасцю і болем, яе духоўным хлебам. Упершыню ў беларускай філалогіі было здзейснена даследаванне “Перыфразы ў сучаснай беларускай мове (структурна-семантычная і стылістычная характарыстыка)”. З лёгкай рукі Ф. Янкоўскага, па яго “настаўнікавай парадзе” ўпершыню ў славістыцы быў выдадзены “Слоўнік перыфраз”, падрыхтаваны Г.М. Малажай, а пасля – манаграфія пра перыфразу. Працалюбства, дасведчанасць, імкненне да мэты давала плён. Г.М. Малажай становіцца членам аўтарскіх калектываў, у склад якіх уваходзяць навукоўцы з Мінска, Гародні і якімі кіруе Ф.М.Янкоўскі. Так з’яўляюцца дапаможнікі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. На вокладках гэтых кніг – і прозвішча Галіны Малажай. Яна – аўтар больш чым 300 навуковых прац. 25 гадоў узначальвала яна кафедру беларускага мовазнаўства, і менавіта падчас яе кіраўніцтва маладыя выкладчыкі абаранілі дысертацыйныя даследаванні, уключыліся ў шырокае кола навуковых лінгваметадычных даследаванняў. На кафедры ўтварылася навуковая лінгвадыдактычная школа Г.М. Малажай, што працягвае традыцыі лінгвістычнай школы Ф.М. Янкоўскага. Галінай Малажай з творчымі калектывамі, якія яна ачольвала, з улікам “Канцэпцыі моўнай адукацыі” былі распрацаваны новыя падыходы ў выкладанні роднай мовы ў школе, вызначаны прыярытэтныя накірункі працы, арыентаваныя на развіццё маўленчай дзейнасці школьнікаў. На аснове новых праграмаў былі падрыхтаваны падручнікі па беларускай мове для 5–8 класаў з рускай мовай навучання, а таксама навукова-метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў.

Імя Г.М. Малажай ды імёны членаў кафедры беларускага мовазнаўства – на вокладках кніг для студэнтаў, настаўнікаў, вучняў. Гэта – Ст. Р. Рачэўскі, Т.М. Кананенка, З.М. Заіка, Н.М.Чалюк, М.І. Пашкевіч, В.М. Касцючык, Л.І. Яўдошына...



Юбілейны год – 60-годдзе філалагічнага факультэта – кафедра сустракае з жалем і смуткам ад непапраўнае страты, з удзячнасцю Настаўніку, прафесару Г.М. Малажай, з вераю ў годны працяг яе высакароднае справы – служэнню роднаму слову.

*М.І. Новік, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства*

## К юбилею – с достижениями

Русская литература и методика её преподавания как одна из областей филологической и педагогической науки исследуется учёными



нашего университета с периода его основания. Однако крупные и значимые работы по литературоведению и методике преподавания появились в 80–90-е годы, когда кафедру возглавил Т.Б. Лиокумович, научные работы которого по взаимосвязи русской и белорусской классики, помещённые в энциклопедическом словаре «Янка Купала» (Мн., 1986 г), а также работы по исследованию белорусских корней пушкинского генеалогического древа «Потомки А.С. Пушкина в Беларуси» (Мн., 1999 г.) внесли большой вклад в развитие русистики в Беларуси.

Знаменательно то, что в центре внимания учёных нашей кафедры – творчество крупных писателей XIX века – начала XX века: А.С.Пушкина, М.Ю.Лермонтова, А.П.Чехова, И.Северянина, И.Шмелёва, М.Цветаевой, Н.Гумилёва, Л.Андреева, М.Булгакова, Е.Замятина, Ф.Искандера.

Определённые успехи достигнуты в исследовании нравственно-философских поисков русской и зарубежной литературы, литературы ближнего зарубежья. В работах Ю.В. Потолкова, М.П. Жигаловой, Н.В. Новогродской, Е.Д. Приступы, М.И. Шелоник, Э.В. Чумакевич затрагиваются проблемы автора и героя, осмысливаются многие художественные произведения в связи с духовными запросами современного человечества. В русле этой проблематики изучается диалектика традиционного и новаторского в словесном искусстве.

В 90-е годы на кафедре стали систематически проводиться международные конференции, в центре внимания которых – взаимодействие и взаимосвязь русской литературы с другими литературами мира. Начиная с 1995 года кафедра ежегодно выпускает научные труды «В мире литературы», в которых отражены проблемы традиции, типологии и поэтики русской литературы и методики её преподавания.

Наши работы свидетельствуют о широком круге исследуемых проблем по русской литературе и методике её преподавания, об их актуальности, литературоведческой и методической значимости. Статистические данные только последних пяти лет свидетельствуют об активном творческом потенциале членов кафедры: была защищена 1 кандидатская диссертация и получено 4 звания доцента; рекомендованы к защите 2 докторские диссертации; изданы 4 монографии, 15 учебных и учебно-методических пособий; написано 126 статей, сделано 56 докладов на международных конференциях. Это свидетельствует о том, что кафедра плодотворно работает и стремится соответствовать уровню и требованиям современной высшей школы.

*М.П. Жигалова,*
*кандидат педагогических наук,*
*член-корреспондент АПСН РФ,*
*Заслуженный учитель Беларуси,*
*и. о. завкафедрой теории и истории русской литературы*

## Вучэбна-метадычны пошук

Кафедра была створана ў 1994 годзе. Узначаліла кафедру кандыдат педагагічных навук прафесар Вера Якаўлеўна Зарэцкая (Ляшук). На той час яна была ўжо адным з вядучых метадыстаў рэспублікі, аўтарам шэрагу навучальных дапаможнікаў па метадыцы выкладання беларускай літаратуры ў сярэдняй школе і ВНУ, краязнаўства на філалагічных факультэтах універсітэтаў і педагагічных інстытутаў краіны.

У склад новай кафедры ўвайшлі кандыдаты філалагічных навук дацэнты У.А. Сенькавец і З.П. Мельнікава, якія мелі ўжо немалы вопыт выкладання ў ВНУ. Спецыфіка створанага навукова-педагагічнага падраздзялення выяўлялася ў яе цесных стасунках з сярэдняй школай, таму ў хуткім часе кафедра папоўнілася выкладчыкамі – нядаўнімі школьнымі настаўнікамі: М.І. Яніцкім, Г.М. Ішчанка, Г.С. Гарадко, А.А. Ігнацюк, А.Д. Каратковым, М.М. Аляшчэнем. З кафедры рускай і замежнай літаратуры перайшла дацэнт Л.В. Асташонак. З цягам часу кафедра расла і за кошт выпускнікоў філалагічнага факультэта, якія выявілі адпаведныя схільнасці да навукова-педагагічнай дзейнасці: на працу прыйшлі Г.М. Снітко, В.М. Смаль і Вяч.М. Смаль. Адной з самых важных задач, што паставіў перад сабой калектыў маладой кафедры, была падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў з вучонымі званнямі і навуковымі ступенямі. Яна была паспяхова выканана: абараніліся і сталі кандыдатамі навук, дацэнтамі А.А. Ігнацюк, Г.М. Ішчанка, М.І. Яніцкі, В.М. Смаль. Завяршылі свае дысертацыйныя даследаванні і прадставілі іх да абароны Г.М. Снітко і Вяч.М. Смаль.

Кафедра методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства – адзіная ў рэспубліцы. За непрацяглы час ёю былі створаны цэлыя вучэбна-метадычныя комплексы па беларускай літаратуры і методыцы яе выкладання ў школе і ВНУ, літаратурным краязнаўстве. Нашы навукоўцы распрацавалі новыя канцэптуальныя падыходы да зместу і структуры літаратурнай адукацыі ў школе і на іх аснове стварылі праграмы і падручнікі для V–XI класаў. У распрацоўцы важнейшых дзяржаўных даручэнняў прынялі ўдзел В.Я. Зарэцкая, Л.В. Асташонак, Г.С. Гарадко, Г.М. Ішчанка, У.А. Сенькавец, Г.М. Снітко, М.І. Яніцкі.

Наватарскія падыходы да распрацоўкі метадычнага апарату падручнікаў, арыгінальнасць вызначылі іх месца на конкурсах на лепшую навучальную кнігу для школы. У 2002 годзе падручнік па беларускай літаратуры для XI класа заняў першае месца, а “Беларуская літаратура. X клас” была адзначана трэцяй прэміяй.

Акрамя калектыўнай вучэбна-метадычнай дзейнасці выкладчыкі кафедры актыўна займаюцца ўласнымі навуковымі пошукамі. На кафедры створана навукова-метадычная школа, заснавальнікам і кіраўнікам якой з’яўляецца В.Я.Ляшук (Зарэцкая).

*У.А. Сенькавец,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры методыкі выкладання*
*беларускай літаратуры і краязнаўства*



## Росшук моўна-культурнай спадчыны

Кафедра гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі пачала свой адлік з чэрвеня 1994 г.



Колам вучэбных і навуковых зацікаўленняў выкладчыкаў (загадчык – дацэнт М.М. Аляхновіч) сталі пытанні гістарычнай граматыкі і гісторыі беларускай літаратурнай мовы, стараславянская мова, параўнальная граматыка ўсходнеславянскіх моў, беларуская дыялекталогія, уводзіны ў мовазнаўства і агульнае мовазнаўства, лінгвакраязнаўства і інш.

Для студэнтаў спецыяльнасці “Беларуская філалогія” распрацаваныя курсы “Крыніцазнаўства гісторыі беларускай мовы”, “Лінгвакультуралогія”, “Мова Брэсцка-Пінскага Палесся ў прасторы і часе”, “Напрамкі арэальнага вывучэння беларускай мовы”, “Моўны этыкет і культура зносін”.

Асаблівасці мовы выданняў Ф.Скарыны – навуковы клопат дацэнта І.У. Сацуты; пытанні фразеалогіі беларускіх літаратурных тэкстаў XIX – пач. XX стст. раскрываюцца ў працах дацэнта М.М. Аляхновіча; гістарычнай дэрывацыі – кандыдата філалагічных навук С.С. Клундук; вобразная аснова беларускай народнай казкі – навуковы інтарэс кандыдата філалагічных навук Л.Ф. Станкевіч; кандыдат філалагічных навук А.В. Макарэвіч скіраваў увагу на традыцыі афармлення ўстарэлых слоў у лексікаграфічных даведніках. Істотныя набыткі мае кафедра ў вывучэнні народных гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся. Актыўна працуюць у гэтым напрамку дацэнты В.М. Емельяновіч і Н.Р. Якубук. Дацэнт Л.В. Леванцэвіч падрыхтавала і апублікавала тры атласы, у якіх даецца дэталёвы агляд гаворак Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Народную тэрміналогію вывучаюць старшы выкладчык Н.П. Аляхновіч, ас. Т.А. Кісель, ас. Л.М. Казлянка.

Асобны, надзвычай важны напрамак навуковых росшукаў – даследаванне моўна-культурнай спадчыны беларускага народа ў курсах лінгвакраязнаўства і лінгвакультуралогіі, дзе актыўна працуюць дацэнт Л.В. Леванцэвіч, дацэнт М.М. Аляхновіч.

Калектыў кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі поўны сіл і задум, жыве і працуе з клопатам пра роднае слова.

*М.М. Аляхновіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі*

## Молодость, успех и перспектива

Кафедра была создана в 1999 году и является самой молодой на филологическом факультете как по времени своего существования (5 лет), так и по возрасту преподавателей (средний возраст – 30 лет). Кафедра многопрофильная, состоит из четырех секций по отраслям филологических дисциплин: классическая филология (ст. преп. Е.А. Митюкова, преп. Л.Н. Грицук, асс. И.А. Люфт), история зарубежной литературы (доц. Е.Г. Ки-



вака, ст. преп. Л.М. Коновод, преп. С.П. Столярчук); полонистика (доц. Е.Г. Кивака, доц. Т.Ф. Кабот, преп. А.М. Дайлида, асс. О.Н. Корсак, асс. Е.К. Жминько) и украинистика (доц. Л.С. Дорошко – в настоящее время докторант кафедры славянских литератур БГУ г. Минск, ст. преп. И.В. Гунчик, преп. Н.В. Колодюк, преп. И.А. Медведь – в настоящее время аспирантка кафедры славянских литератур БГУ г. Минск).

В 2002 году кафедра провела ЙМеждународную научную конференцию, посвященную 160-летию со дня рождения Марии Конопницкой. С 1998 года Е.Г. Кивака проводит при участии консульства РП ежегодный университетский фестиваль поэзии Марии Конопницкой, победители которого успешно выступают на Международном фестивале в Гурах Мокрых (РП). Ежегодно студенты выезжают на страноведческую, языковую и научно-методическую практики в Седльце, Гарволин, Люблин, Львов, Киев, Луцк, участвуют в научных студенческих конференциях за рубежом.

При кафедре работают несколько студенческих кружков. Преподаватель С.П. Столярчук руководит литературной студией “КЛИН”, которая объединяет поэтически одаренных студентов филологического факультета. Доцент кафедры Л.С. Дорошко руководит студенческим экспериментальным театром «Арт-Майдан», который функционирует с 1995 года, и за 10 лет своего творческого существования принял участие во многих международных фестивалях, гастролировал со своими постановками в Украине, выступал на благотворительных мероприятиях как в ближнем зарубежье, так и на Брестчине.

Преподаватели кафедры участвуют в Международных научных конференциях, проводимых в польских и украинских университетах и Академиях, с которыми сотрудничает наша кафедра в рамках Договоров о сотрудничестве с соответствующими зарубежными вузами: Волынский государственный университет им. Леси Украинки, Киевский национальный педагогический университет им. М.П. Драгоманова, Черновицкий национальный университет им. Ю. Федьковича, Львовский национальным университет им. И. Франко, Университет им. Марии Кюри-Склодовской в Люблине, Академия Подлясская в Седльцах. У нас работают приглашенные кандидаты и доктора филологических наук из вузов Польши и Украины.

Кафедрой ведутся научные исследования по трем основным направлениям: славянская филология (польский язык и литература и украинский язык и литература); история зарубежной литературы (от Средневековья до современности); классическая филология (латинский язык и античная филология). Научная тема кафедры, которая объединяет столь различные направления в области филологии, касается актуальных проблем современного компаративистического анализа.

Е.Г. Кивака, Л.С. Дорошко, И.В. Гунчик публикуются в солидных зарубежных изданиях.

*Е.Г. Кивака,*
*кандидат филологических наук,*
*доцент, завкафедрой классической и современной зарубежной филологии*

*Напіша вершык хтосьці, калусьці*
*Э ты зразумееш, што шчасце ёсць.*
*Што ўся безнадзёга – штосьці,*
*чалусьці...*
*А ты ў жыцці, не болей як госць.*

*Прыдумаюць песню на новыя ноты,*
*Забудуць матыў стары памяняць.*
*Э ты зноў уцяміш, што сум,*
*адзіноту,*
*Не выправіць хутка і ў час*
*не прагнаць.*

*Э твой самажаль, лірычныя струны,*
*То гучна, то ціха – заўсёды*
*гучыць.*
*Э ты адчуваеш, што шэрыя думы*
*Яшчэ паўстагоддзя ў табе*
*будуць жыць.*

*– Хіба гэта многа? – скажуць па...*
*– Хіба гэта час? – здзівіцца Бог.*
*А ты застанешся, надзеяй сагрэты,*
*З пустою душой,*
*ля разбітых дарог...*

***Мікола Сімановіч, 4 курс***

“Берасцейскі універсітэт” – спецыяльны выпуск
Рэдактар – Н.В. Кірчук, набор і вёрстка – С.С. Бурштын,
фота – В.С. Хрыстафораў
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме аддзела МіМС БрДУ
224665, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21, т. 23-01-29
Рэдакцыя нясе адказнасць за якасць арыгінал-макета
Аб‘ём – 1 умоўны друк. аркуш
Тыраж 299 экз. Заказ №
Падпісана ў друк
Надрукавана ў
ААТ “Брэсцкая друкарня”
224013, г. Брэст, пр. Машэрава, 75
Кансультант – Л.А. Гадуйка